# Васіль Быкаў: нарысы пра Аляксея Карпюка

З выдання:

**Быкаў, В. У. Выключэньне Карпюка / Васіль Быкаў // Быкаў В. У. Поўны збор твораў : у 14 т. / Васіль Быкаў. – Мінск, 2009. – Т. 8. – С. 246–250.**

**Быкаў, В. У. Карпюк і генерал Гарбатаў / Васіль Быкаў // Быкаў В. У. Поўны збор твораў : у 14 т. / Васіль Быкаў. – Мінск, 2009. – Т. 8. – С. 235–238.**

**Быкаў, В. У. Танкі ў Празе. Карпюк / Васіль Быкаў // Быкаў В. У. Поўны збор твораў : у 14 т. / Васіль Быкаў. – Мінск, 2009. – Т. 8. – С. 232–235.**

## Выключэньне Карпюка

Над намі ў Горадні штосьці зьбіралася, згушчалася, набрыняла чаканьнем. Мы пэўна ня ведалі, што, але адчувалі — будзе нядобрае. Неяк на вуліцы я спаткаў трохі знаёмую настаўніцу з Зэльвы. Як звычайна, папыталіся адно ў аднаго пра жыцьцё, я сказаў, што хваліцца няма чым. І яна суцешыла: вясной стане лепей. Што лепей? Настаўніца пасьмяялася: а можа, і горай. Хто сказаў? Мае карты гавораць...

Я хутка забыўся на тую размову, як аднойчы ў рэдакцыі пачуў: пасьля абеду — закрыты партсход. Закрытыя партсходы здараліся нячаста, звычайна праводзілі адкрытыя, на якія я, канешне, не хадзіў. Карпюк змушаны быў хадзіць, ён быў на партуліку ў рэдакцыі. Прыйшоў і цяпер, зазірнуў да мяне ў аддзел саўработы, дзе я сядзеў. Твар яго быў змрочны, і ён адразу сказаў: «Будуць выключаць». — «Каго?» — «Мяне...». Во гэта навіна, падумаў я. Завошта? Чаму? Што здарылася?

Але што здарылася, пра тое неўзабаве стала вядома.

Прыйшоў прадстаўнік з гаркаму, абвясьціў цэлы стос палітычных грахоў члена КПСС Аляксея Карпюка і вынес на абмеркаваньне прапанову гаркаму — выключыць. Карпюка ў рэдакцыі ведалі гадоў, можа, пятнаццаць, старэйшыя работнікі некалі працавалі зь ім, і мала хто з разуменьнем паставіўся да тае прапановы гаркаму. Праўда, ведалі ягоны няўрымсьлівы характар, але паважалі яго як героя вайны, вядомага на Гарадзеншчыне партызанскага камандзіра. Як пачалі галасаваць, толькі тры ці чатыры камуністы (пераважна адстаўнікі-вайскоўцы) прагаласавалі за выключэньне, астатнія — за вымову. Прадстаўнік гаркаму сваё заданьне ня выканаў і пайшоў незадаволены. Трэба было чакаць працягу.

І сапраўды, працяг не замарудзіў зьявіцца — праз тыдзень Карпюка выклікалі на бюро гаркаму і выключылі аднагалосна.

На вуліцы ў абедзенны перапынак я спаткаў першага сакратара гаркаму Магільніцкага, якога трохі ведаў, і спытаў: за што так строга? Хіба Карпюк — злачынца? А ён мне адказвае: «Горш чым злачынца». І пайшоў, не разьвітаўшыся. Разгублены, я пайшоў у другі бок і думаў. Колькі іх, гэткіх

сакратароў, валадароў нашых лёсаў, прайшло панад намі? Над кожным пэўны час зьзяў валадарны німб сілы і сьвятасьці, здавалася, яны маглі ўсё. І яны рабілі тое, чаго ад іх вымагалі іншыя, вышэйшыя, яшчэ з большым німбам. У тым яны бачылі ці не адзіны сэнс сваёй працы і чакалі, калі будуць аддзячаны кар'ерай і вышэйшасьцю. Але здаралася, што і згаралі — ад празьмерных высілак, п'янкі ці амаралкі і сыходзілі ў нябыт на другі ж дзень, як вытрасаліся з сваіх кабінэтаў. Бы іх і не было ніколі. Тады на іх месца прыходзілі іншыя — таксама зь нязьменным німбам партыйнасьці, і ўсё пачыналася спачатку. Што да Магільніцкага, дык менавіта на справе Карпюка ён узьнёсься высока — аж да пракурора рэспублікі, каб у свой час гэтак жа нізка гэпнуцца і згарэць. Цяпер яго ў Горадні няма чым і прыпомніць. Хіба ў зьвязку з ганебнай расправай над пісьменьнікам Карпюком.

Але Карпюк быў ня з тых, хто мог бязвольна скарыцца ўладзе, ці ворагу, ці звычайнай жыцьцёвай бязглузьдзіцы. Усё жыцьцё гэты чалавек імкнуўся асядлаць свой лёс, хаця тое і каштавала яму аграмадных высілкаў і далёка не заўжды ўдавалася. Але ўдавалася нават у вайну, як ён уцякаў з канцлягеру, пасьля выбавіўся ад расстрэлу ў партызанскай брыгадзе. Ды й на фронце ўвогуле яму шэнціла, бо пазбыцца пагібелі зь яго цяжкой ранай ня кожнаму ўдалося б. Карпюк выжыў. Зь ягонай прагай да жыцьця ён жыў бы і болей, калі б тое жыцьцё не ўкарацілі зламысьнікі.

Для Карпюка пачалася доўгая паласа душэўных пакутаў, хаджэньняў па інстанцыях, па ўсіх гэтых парткамісіях зь іх драпежным партыйна-партызанскім актывам. Ужо тыя, пра каго Карпюк гаварыў і пісаў, што яны за вайну ні разу ня стрэлілі ў жывога немца, паказалі сваю прынцыповасьць — аднагалосна адвяргалі Карпюковы апэляцыі. Сінхронна спрацавалі і ягоныя калегі ў Саюзе пісьменьнікаў — зьнялі Карпюка з працы сакратара абласнога аддзяленьня. З тым загадам у Горадню прыехаў сакратар СП Грачанікаў, які, аднак, паслаў сваё менскае начальства на тры літары і да адыходу цягніка зашыўся ў рэстаране, чым выклікаў нашае да яго шанаваньне.

Канешне, бяда ня ходзіць адна. У той час беды кружлялі карагодамі. Захварэла Карпюкова жонка, настаўніца Іна Анатольеўна, Аляксей змушаны быў адвезьці яе ў Бараўляны. На руках у беспрацоўнага пісьменьніка засталося трое дзяцей. Кніжкі, што меліся неўзабаве выйсьці, апэратыўна павыкідвалі з выдавецкіх плянаў. Грошай ня стала, як ня стала і ніякіх спадзяванак на іх. Карпюк пазычаў у мяне, але я таксама ня быў багаты і пісаў у літфонд заявы аб аднаразовай дапамозе — для сябра. Яму дапамогі ўжо не давалі. Часам, у шэрую гадзіну мы дзе-небудзь спатыкаліся ўтрох — Карпюк, Клейн і я — меркавалі, як быць? Клейн раіў не пагаджацца — змагацца, пісаць — праўда на тваім баку. Але каму патрэбна была Карпюкова праўда?

Як пасьля стала вядома, у абласным КДБ вылучылі адмысловага афіцэра, маёра Хаміна, які засеў «хімічыць» на Карпюка крымінальную справу. Выключэньне з партыі было толькі пачаткам — чалавека належала пасадзіць. Паколькі Карпюк меў геройскую рэпутацыю з вайны, вырашылі падлавіць яго менавіта з гэтага боку. Маёр зьезьдзіў у Польшчу, па вайсковых сьлядох Карпюка, наведаў Штутгоф, дзе той сядзеў і адкуль уцёк, шукаў кампрамат і дакумэнты. Ну і, вядома, пакарыстаўся ўласнай фантазіяй, — сачыніў, чаго не хапала. Сачыняць яны ўжо ўмелі, былі адукаваныя. Гэта колішнія чэкісты былі з абмежаваным уяўленьнем і змушалі зэкаў саміх прыдумваць сабе злачынствы. Гэтыя сачынялі самі.

Мінула трохі часу, і, як пасьля стала вядома, старшыня тадышняга Камітэту дзяржбясьпекі СССР Ю. Андропаў[238] дакладваў у ЦК КПСС: «Камітэт дзяржаўнай бясьпекі Беларусі мае зьвесткі аб нездаровых настроях беларускіх пісьменьнікаў – члена КПСС Карпюка і Быкава… Карпюк нелегальна распаўсюджвае сярод сваіх знаёмых усялякія пасквілі ў выглядзе кнігі Гінзбург-Аксёнавай “Круты маршрут” і іншыя. Адмоўна ўзьдзейнічае на моладзь. Пад яго ўплывам студэнт Гродзенскага педінстытуту Малашэнка піша вершы, прасякнутыя пэсімізмам і ўпадніцтвам, некаторыя зь іх утрымліваюць шкодны палітычны сэнс… Погляды Карпюка ў пэўнай ступені падзяляе Быкаў, аўтар тэндэнцыйнай аповесьці “Мёртвым не баліць”… У цяперашні час да Быкава выказваюць інтарэс ідэалягічныя цэнтры ворага. Гэта відно, прынамсі, зь перапіскі зь ім супрацоўніка закрытага сектара “Народна-працоўнага саюзу” (НПС), якая вядзе яго антысавецкую апрацоўку. З Быкавым устанавіў кантакт італьянец Поджы, які падазраецца ў прыналежнасьці да спэцорганаў ворага… Камітэт дзяржаўнай бясьпекі Беларусі з санкцыі ЦК кампартыі рэспублікі рыхтуе мерапрыемствы, накіраваныя на прадухіленьне магчымых варожых акцый з боку названых асобаў».

## Карпюк і генэрал Гарбатаў

Седзячы ў Доме Ажэшкі, Карпюк прачытаў у «Новом мире» ўспаміны генэрала Гарбатава, дзе ягоную ўвагу прыцягнуў не расповед генэрала пра сваю кар'еру і франтавыя подзьвігі, а скупое паведамленьне пра тое, што генэрал ня п'е. І ніколі ня піў. Уражаны такім дзівам, Карпюк сунуў часопіс у кішэню і пабег на вакзал. Там, не пасьпеўшы сказаць нават жонцы, сеў у маскоўскі цягнік і ранкам быў ужо ў Маскве. Пасьля працяглых перамоваў з палкоўнікамі Генэральнага штабу раздабыў адрас Гарбатава, які жыў каля Нікіцкіх варот. Карпюк пазваніў у дзьверы, і папярэджаны з генштабу генэрал яго ўпусьціў. Карпюк ветліва прадставіўся — беларускі пісьменьнік, ветэран вайны. Генэрал пасадзіў госьця за маленькі столік, дастаў з шафы гранёны графінчык. Карпюк хацеў абразіцца і заўважыў, што ў часопісе генэрал напісаў, быццам ня п'е. Аказалася, сапраўды ня п'е, а графінчык — для госьця. Тады Карпюк горача пацiснуў генэральскую руку, радасна паведаміўшы, што таксама ня п'е. І выклаў яму патрэбу, зь якой прыехаў у Маскву. Ва ўсіх краінах сьвету ёсць таварыствы цьвярозых, а ў нас няма. А між тым шкода ад п'янства... І г. д. Таму трэба зьвярнуцца да грамадзкасьці зь лістом, падпісаным аўтарытэтнымі людзьмі, вось як вы і я, і стварыць таварыства. Тэкст ліста ўжо гатовы, вось пачытайце...

Трохі зьбянтэжаны генэрал прачытаў тэкст і цяжка ўздыхнуў. Справа добрая, сказаў ён. Але хто падпіша? Сярод яго знаёмых цьвярозага генэрала яму не знайсьці. Можа, сярод пісьменьнікаў?..

Карпюк задумаўся. Канешне, ён разумеў, што двух подпісаў было замала для такога ліста, патрэбны быў трэці. Ды знайсьці яго сярод пісьменьнікаў таксама праблема. І раптам ён успомніў пра Адамовіча, які тады быў у Маскве на нейкіх курсах. (Стаўшы ўжо доктарам навук, той усё вучыўся.) Карпюк пабег па Маскве шукаць Адамовіча.

Ён шукаў яго цэлы дзень да вечару, аб'ехаў усе вядомыя рэдакцыі, абзваніў знаёмых. І высьветліў, што Адамовіч сёньня едзе ў Менск. Тады Карпюк купіў білет на вечаровы цягнік і, як той рушыў з Беларускага вакзалу, пачаў абход вагонаў. Ён іх абышоў усе, зазіраў у кожнае купэ і каля Смаленску сапраўды знайшоў соннага Адамовіча. Той выслухаў яго прапанову і сказаў: «Я гатовы ўступіць. Але толькі з умовай разваліць яго знутры». І лёг спаць. Карпюк аблаяў Алеся і выйшаў з цягніка. Раніцай прыехаў да Нікіцкіх варот і аб'явіў генэралу, што трэцяга цьвярозага чалавека ў Расеі не знайшоў. Так высакароднае таварыства не было створана. Ні тады і ніколі болей.

Карпюк, як ён пасьля распавядаў, дарма зьвязаўся з вайскоўцамі, хоць бы і з генэраламі. У сваім жыцьці ён пераканаўся, што з гэтым народам лепей справы ня мець. У вайну Карпюк камандаваў партызанскім атрадам, пасьля ваяваў на фронце, быў двойчы цяжка паранены, а афіцэрскага званьня так і ня выслужыў.

У той жа час хлопчыкі, што прыходзілі з унівэрсытэту, так бы мовіць, авансам былі лейтэнанты. А некаторыя і пры ўзнагародах, заслужаных і ня надта. Карпюку ж не далі сабраць нават заслужаныя ім на вайне медалі.

Займеўшы аднойчы вольны час, ён узяўся напісаць лісты.

Адзін быў міністру абароны наконт таго, каб яму выдалі заслужаны ім медаль за ўзяцьце Бэрліну, другі — дзядзьку на Урал. Дзядзька пісаў даўно ўжо, што жыве кепска, з прадуктамі трудна, прасіў дапамогі. Дык пляменьнік яму напісаў: кінь ты гэта расейскае жыцьцё, прыяжджай у Беларусь, тут бульбачкі хопіць. Той жа дзень аднёс лісты на пошту.

І вось праз нейкі час прыбягае з ваенкамату пасыльны, прыносіць позву. Карпюк парадаваўся — ці не прыйшоў ад міністра мэдаль? Прыйшоў да палкоўніка-ваенкама. Той чамусьці глядзіць ваўком, а потым падае аркуш паперы і кажа: «На чытай». Карпюк моўчкі чытае. «Не, ты гучна чытай», — кажа ваенкам. А там на бланку Міністра абароны Саюза ССР напісана: «Загадваю. Параграф першы. Выклікаць і растлумачыць грамадзяніну Карпюку А. Н., што я ў сваяцтве зь ім не знаходжуся і дзядзькам яму не зьяўляюся. Параграф другі. Гродзенскаму аблваенкаму палкоўніку такому-та за нізкі ўзровень палітмасавай работы з асабовым складам аб’яўляю вымову. Міністр абароны маршал Савецкага Саюзу Г. Жукаў». — «Ты зразумеў? — пытаецца ваенкам. — Мне праз паўгода на пэнсію, хто мне цяпер гэтую вымову зьніме? Ці мне бяз пэнсіі ў адстаўку ісьці? Во што ты нарабіў, разгільдзяй!»

Прыгнечаны, з сапсутым настроем Аляксей вярнуўся дадому, дзе яго чакаў ліст ад дзядзькі. Той пісаў хімічным алоўкам на школьнай старонцы: «Дарагі пляменьнік, ці ты там з глузду зьехаў у сваёй Горадні, — які я табе маршал і дзе я табе вазьму гэны мэдаль? Я і ў войску ні дня не служыў...».

Зь дзядзькам, канешне, адносіны ўлагодзіліся, а прадстаўленьне на афіцэрскае званьне ў Карпюка ляснула. Карпюк быў у недаўменьні: падумаеш, напісаў! Я ж маршала не аблаяў. Дык праз тое да пяцідзесяці год хадзіць радавым? А гэтыя, што ў вайну ні разу па жывым немцу ня стрэлілі, ужо маёры запасу. Вунь як той Гаўрушка, што самагон на хутары для камбрыга гнаў. Цяпер ён член бюро гаркаму, – абураўся Карпюк. Тады ён яшчэ не прадбачыў, што прыйдзе час, і гэты брыгадны самагоншчык дасца Карпюку ў знакі...

## Танкі ў Празе. Карпюк

У мяне быў транзістарны прымач з кароткімі хвалямі — японскі «Панасонік», які я ці ня кожную ноч настройваў — лавіў «Свабоду», Бі-Бі-Сі, «Голас Амэрыкі». З усіх, аднак, аддаваў перавагу «Свабодзе». Добра пачуць яе рэдка ўдавалася — глушылі заўжды і шчыльна. Некаторыя раілі шукаць здатнае месца ў кватэры, каля водаправодных трубаў, паспрабаваць настройваць за горадам. Я спрабаваў і так, і гэтак — часьцей за ўсё нічога не атрымлівалася. Перадатчыкі былі за тысячы кілямэтраў, а глушылкі — во яны, побач, на ўскраіне горада. Няўдалымі былі ўсе мае спробы і ў тую ноч. А менавіта тады хацелася дазнацца пра падзеі, што высьпявалі ў адносінах да Чэхаславаччыны, на якую нацэліўся «крыважэрны блок НАТА».

«Міралюбны» Варшаўскі блок рыхтаваўся яе ратаваць.

Раніцай, як заўжды, скіраваў у рэдакцыю і на пешаходным мастку цераз чыгунку спаткаў Клейна. Барыс здаўся нязвыкла маўклівы, на чымсь засяроджаны і толькі буркнуў: «Ну, чуў? Яны ўвялі. Танкі ў Празе...»

Тое, вядома, ашаламляла. Я тады зразумеў вэрхал, што ноччу не даваў спаць — на вуліцах штось адбывалася, ішлі калёны машынаў, даносіліся чыесь галасы, у пад’ездах грукалі дзьверы і бегалі нейкія людзі. Аказваецца, ішла мабілізацыя, як на вайну. У дапамогу перадавым часьцям, што ўвайшлі ў Чэхаславаччыну, на базе Гарадзеншчыны разгортвалася рэзэрвовая армія. Хапалі запасьнікоў, мабілізоўвалі транспарт, на ўскраінах у вайсковых гарадках фармавалі каманды. Як пасьля выявілася, тэлефоны гарадзкой сеткі ў тую ноч былі адключаны. Мы з Клейнам выправіліся да Карпюка.

Яшчэ на падыходзе да Дому Ажэшкі, дзе звычайна працаваў Карпюк, пачулі, як на ўсю вуліцу гучэла перадача Б-Бі-Сі, распавядала, што савецкія войскі акупуюць Прагу. На вуліцы было нямала прахожых, некаторыя спыняліся, слухалі, а бальшыня хуценька кудысьці бегла. Мы тузанулі дзьверы Карпюковага офісу, тыя былі не замкнёныя, а ў пакоі на канапе ляжаў Карпюк. Ён быў у поўнай вайсковай форме, побач на стале ляжала яго партупея і кірзовая палявая сумка. Карпюк хутка ўскочыў, працёр вочы. Мы выключылі транзыстар. «Во, халера, праспаў», — мовіў змабілізаваны ваяка. Аказалася, што ён усю ноч прабыў у Фолюшы на фармоўцы, раніцай прыехаў сюды і заснуў. Цяпер хутка адпраўка на вызвольны паход у Чэхаславаччыну. «І ты пойдзеш?» — папытаўся Клейн. — «Абавязкова. Ужо я там напішу», — быў яго выразны адказ.

Карпюк хутка паехаў на зборны пункт, і што зь ім было далей, стала вядома празь некалькі дзён.

Вялізную мэхкалёну з мабілізаванымі выцягнулі на шашы ў напрамку польскай мяжы. Прыехала начальства з акругі, пачалі правяраць. Хадзілі адны, другія, трэція. Карпюк цярпліва сядзеў у кузаве МАЗа. І раптам паявіўся

начальнік палітаддзелу акругі генэрал Дэбалюк. «А гэты нашто? — кіўнуў ён на Карпюка. Нейкі палкоўнік пачаў штосьці тлумачыць, але генэрал не даслухаў: «Зьняць! Ён не паедзе». Давялося Аляксею злазіць з высокага кузава, на спадарожных машынах дабірацца да Горадні. Калёна пайшла да Чэхаславаччыны без Карпюка.

Карпюк, безумоўна, быў чалавек сумленны і, магчыма, нават хацеў быць сумленным камуністам. Але ня ведаў, як ім можна быць. І наогул, што гэта такое — сумленны савецкі чалавек? Што пэўна, ён не любіў хлусьні і не цярпеў непарадку — хоць у літаратуры, хоць у войску таксама. Таму, здаўшы ў Фолюшы сваю амуніцыю, пайшоў уздоўж калючага дроту агароджы паглядзець, ці не засталося што забытае ягонымі папярэднікамі. І — во дзіва! Убачыў у траве тры пакінутыя карабіны. Адчуваючы з вайны каштоўнасьць зброі, ён узваліў карабіны на плечы і панёс да капцёркі. Але тая аказалася ўжо зачыненай — усе пайшлі на фронт. Каб ня кідаць карабіны ў лесе, давялося іх везьці ў горад, у штаб арміі. Там, аднак, карабіны ўзяць адмовіліся — ня нашай часьці. А ўжо настала ноч, і ён змушаны быў несьці карабіны дамоў. Адтуль патэлефанаваў мне: во халера, што мне рабіць? Кажу: там за тваім домам цячэ Ванючка, бухні туды твае карабіны, і справе капец. Ён мяне аблаяў: ты быццам у войску не служыў, ня ведаеш, што такое аружжа. Я, кажу, ведаю. Гэтым аружжам загаўняны ўвесь сьвет. Тваіх трох там не хапае... Не паразумеліся тады мы з Карпюком, ледзь не пасварыліся. Назаўтра ён пачаў хадзіць з тымі карабінамі зноў, аж покуль у яго не запатрабавалі пісьмовага тлумачэньня: дзе і зь якой мэтай узяў і г. д. Ледзьве ён выбавіўся з таго канфлікту, які сам сабе і стварыў.

Цікава, што мяне ў тую мабілізацыю не ўзялі. Можа, прычынай таму — мой стрыечны брат, што паводле анкеты «пражываў у Заходняй Нямеччыне». А можа, і яшчэ што. Зрэшты, ня ў прыклад Карпюку, я туды і ня рваўся і думаў: можа, і лепш, што Карпюка вярнулі. Тыя, што туды паехалі, распавядалі пасьля, як іх у якасьці рэзэрву пратрымалі на чэхаславацка-польскай мяжы, чакалі рэакцыі блёку НАТА, які так і не праявіў ніякай рэакцыі. Тое выклікала захапленьне сярод пэўнай часткі гродзенцаў — ага, спалохаліся нашай магутнай Савецкай арміі! Пра чэхаў казалі: свабоды ім захацелася! Мы ж во жывём без свабоды, але не бунтуем. А ім — свабоды! Яшчэ чаго! І так гаварылі ня горшыя і ня самыя дурныя з нашых знаёмых. А можа, яны так толькі гаварылі, а думалі інакш? Але што карысьці з правільных думак, калі іх трэба выказваць няправільна, перакручана, наадварот. Мабыць, каб выказаць сумленную думку і ня выклікаць падазрэньня, трэба было мець дужа адмысловы розум, якім мала хто з нас валодаў. Мы былі надта прастадушныя ў думках і просталінейныя ў дзеяньнях, за што і цярпелі.